# Выступленне А. А. МАЛАФЕЕВА, першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі

## на Пленуме ЦК КПСС 25 ліпеня 1991 года

З пачуццём горычы і прыкрасці ўспамінаю мінулы Пленум ЦК. Ён унёс новы разлад у нашу партыю, узмацніў недавер камуністаў адзін да аднаго, у тым ліку і да кіраўніцтва.

Кампартыя, па сутнасці, калі назваць рэчы сваімі імёнамі, адхілена ад выпрацоўкі дзяржаўнай палітыкі. Нават члены Палітбюро не маюць сапраўднай магчымасці ўдзельнічаць у ёй. У той жа час шырацца спробы перакласці на яе плечы ўсю адказнасць за развал грамадства, за памылкі канкрэтных асоб.

У самой КПСС крытычнай адзнакі дасягнулі разлад, браджэнне, няўзгодненасць, пагроза яўнага расколу. Нельга не бачыць, як шырыцца хваля антыкамунізму. КПСС яшчэ больш становіцца аб'ектам нападак, я сказаў бы, — самавольства. Яе працаўнікі, прыбраўшыся ў тогу дэмакратаў, ігнаруючы Канстытуцыю, існуючыя законы, мабілізавалі і арганізавалі ўсё для насільнага разбурэння партыі. Калі так пойдзе і далей, дык гэта можа падштурхнуць пэўныя сілы да фізічнай расправы над камуністамі. Вось дзе глеба для ўзнікнення дыктатуры, звароту да горшых часоў нашага мінулага. Я думаю, падобныя з'явы сёння недаацэньваць проста нельга.

Расце напружанасць у грамадстве, зусім расстроены эканоміка і фінансы, разбураецца прамысловая і сельскагаспадарчая вытворчасць, пагражаючы вось-вось пакінуць людзей без работы, кавалка хлеба, без ахоўы ад ценевікоў і злачыннага свету.

У верхнім звяне кіравання сёй-той спадзяецца, што выйсце са становішча трэба шукаць у шырокім прымяненні свабодных цэн. Вось гэта, думаю, і ёсць памылка. Людзі не вытрымаюць яшчэ аднаго цэнавага ўдару. Калі гэта здарыцца, дык не пазбегнуць цяжкага сацыяльнага выбуху, які канчаткова можа падарваць, ды і падарве давер да ўлады, прычым на ўсіх узроўнях. Пазіцыя Кампартыі Беларусі тут адназначная. Трэба зрабіць усё, каб спыніць падзенне жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Вось галоўнае пытанне сённяшняга дня. Без адказу на яго ўсе нашы размовы і любое абмеркаванне самай цудоўнай праграмы стануць зусім бяссэнсавымі.

І калі ў такі час гучаць словы, што народ падтрымлівае ўсё, што адбываецца ў краіне, натуральна, у поўнай меры з гэтым згадзіцца нельга. Людзі ўхвалялі тое, што было звязана з першымі гадамі перабудовы, а цяперашні яе стан выклікае вострую трывогу і крытыку насельніцтва. Ствараецца ўражанне, што дзяржаўны карабель аддадзены на разарванне стыхіі. Можа, нехта думае інакш, але прынамсі ў мяне складваецца такое меркаванне. За гэта, вядома, расплачваецца ні ў чым не вінаваты чалавек. Яму становіцца жыць усё больш сумна і цяжка.

Відавочна, што цяперашняму саставу Палітбюро і Сакратарыята ЦК КПСС будзе цяжка змяніць абстаноўку ў партыі, удыхнуць у яе новае жыццё. Бясспрэчна, хацелі б мы ці не, наспела пытанне аб скліканні чарговага з'езда КПСС, прычым ужо ў бліжэйшыя месяцы. Хоць і ілюзіі будаваць не трэба. З'езд не зможа вырашыць усе пытанні, калі сама партыя не будзе займацца імі як след. Таму Праграма павінна аб'яднаць. І калі яна не будзе адпавядаць належным патрабаванням, дык пасля з'езда можа ўтварыцца ўжо не адна партыя. І гэту небяспеку трэба ўлічваць.

Што датычыць самой Праграмы. Я сам член гэтай камісіі. У праекце многае ўдалося, ёсць удалыя пазіцыі, палажэнні. Але калі называць рэчы сваімі імёнамі, трэба прама сказаць, што праект у цяперашнім яго выглядзе не адпавядае спадзяванням камуністаў. Нам няма патрэбы прыстасоўвацца да розных палітычных плыняў, што ўзніклі ў партыі ў апошні час, іх погляды і падыходы ў многім з'яўляюцца непрыдатнымі, але, я думаю, і адкідваць іх не трэба. Трэба ўзяць усё разумнае, што можна выкарыстаць у ходзе дапрацоўкі дакумента.

У разглядаемым праекце змяшчаецца набор агульнадэмакратычных палажэнняў. Наогул, прама скажам, прывабных, але хутчэй за ўсё характэрных для партыі сацыял-дэмакратычнай арыентацыі. У ім губляецца аблічча палітычнай партыі і менавіта нашай, што спадае камуністычныя ідэалы. КПСС, у выпадку прыняцця гэтай Праграмы, практычна перастане быць партыяй палітычнага дзеяння. У праекце адсутнічае механізм рэалізацыі пастаўленых мэт, а гэта ж з'яўляецца галоўным, з-за чаго мы сёння і пакутуем. Зусім не ясна, як можа дасягнуць адзінства дзеянняў палітычная арганізацыя, што базіруецца на такіх размытых арганізацыйных прынцыпах. У праекце нават членскія ўзносы абвяшчаюцца справай добраахвотнай: ёсць магчымасць — кінь грыўню. Я думаю, што гэта непрымальна. Давайце будзем шчырыя і прызнаем — словы на тытульным лісце гэтага дакумента аб тым, што гэта Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, пакуль яшчэ не напоўнены сапраўдным зместам. Час для гэтага ёсць. І думаю, гэта можна зрабіць. А праект, бясспрэчна, трэба прымаць за аснову.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы